# ЛІТАРАТУРНАЯ ХВІЛІНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Час ідзе вельмі хутка. Яшчэ год таму я думала, што выступаць на публіцы – гэта вельмі страшна. Зараз я дакладна ведаю, што выступаць на публіцы зусім не страшна, але вельмі і вельмі адказна, асабліва калі ты выступаеш перад дзецьмі. Чаму? Таму што разумееш, як складана данесці да дзяцей сэнс тваіх твораў, як адказна дакрануцца словамі да дзіцячых сэрцаў, і кожны раз перажываеш за тое, каб усё сказанае пакінула добры след у дзіцячых душах. Справа пісьменніка, як справа ўрача, – павінна кіравацца адным прынцыпам: не нашкодзь. Сёння ў мяне быў надзвычай цікавы дзень. Нягледзячы на тое, што гэта нядзеля, я выступала ў дзіцячым лагеры "Навука", які знаходзіцца ў аграгарадку Парэчча (Гродзенскі раён). Лагер выбрала не выпадкова – там знаходзіцца мая дачушка. За некалькі дзён да гэтага я звярнулася да кіраўніцтва лагера з прапановай правесці для дзяцей літаратурную хвілінку і атрымала станоўчы адказ. Да сустрэчы падыходзіла адказна. Вершы падбірала розныя. Я, канешне, не дзіцячы пісьменнік, але і дзеці, да якіх я ехала, ужо не маленькія. Кожнаму з іх па 15-16 гадоў, да таго ж большасць з іх гісторыкі, таму паразмаўляць можна было сур'ёзна.

Выступленне сваё я пачала са знаёмства, а потым, як гаворыцца, аб усім па крышачку. Не засталася без увагі тэма 80-годдзя Вялікай Перамогі. Лічу, што пра гэта нельга не гаварыць, бо гэта наша памяць. Памяць, за якою заўсёды будуць стаяць мір і згода ва ўсім свеце. Пакуль мы помнім – мы застаёмся пад надзейнай аховаю Бога. Я паказала дзецям кнігі, якія да дня Перамогі былі выдадзеныя Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, пачытала свае вершы, якія знаходзяцца ў іх, і расказала гісторыі сваіх дзядоў-герояў. Потым я звярнулася да дзяцей з просьбай: не забываць імёны сваіх продкаў, якія аддалі жыцці за тое, каб сёння мы жылі пад мірным небам. Папрасіла дзяцей, каб распыталі ў родных пра мінулую вайну, каб ведалі цану Перамогі, затым расказалі пра гэта і сваім дзецям. Гэта важна! Гэта неабходна!

Гучалі вершы пра Радзіму, пра родную мову, пра бацькоўскую хату і пра тое, што быць пісьменнікам сапраўды цяжкая справа. Пісьменнік не належыць сабе – гэта насамрэч так і ёсць. Дзесьці чытала, што пісьменніку павінна балець усё. І яно баліць. За гэтым болем іншы раз не заўважаеш ні надвор'я, ні пары года, ні самога сябе. Як сказаў сёння важаты Максім Вячаслававіч: "Умець пісаць – гэта нешта звыш". Вось кожны пісьменнік і працуе над тым, каб гэтае "звыш", якое дадзена Богам, данесці да кожнага-кожнага чалавека.

Пасля вершаванага блока я прапанавала дзецям крышачку пагуляць. Мая дачушка да тыдня рускай мовы ў школе рыхтавала рэбусы, у якіх зашыфраваныя імёны рускіх пісьменнікаў. Я вырашыла пазычыць у дачушкі рэбусы і прапанавала разгадаць іх дзецям. Дзеці прынялі маю

прапанову з радасцю. Яны хуценька разбіліся на дзве каманды, і пачала кіпець работа. Сур'ёзная атмасфера змянілася на гульню, і гэта ўнесла нейкі новы смак у сустрэчу. Пасля рэбусаў кожны атрымаў салодкі падарунак. Затым мы зрабілі агульны фотаздымак і падзякавалі адзін аднаму за сустрэчу.



У цэлым хачу вам сказаць, што ў нас расце цудоўная моладзь. Канешне, яна адрозніваецца ад нас, але ж яна і не павінна быць такою, як мы. Час ідзе, і ўсё мяняецца – так было і будзе заўсёды. Дык давайце не будзем крытыкаваць сучасных дзяцей, а паспрабуем быць бліжэй да

іх, паспрабуем іх зразумець, і магчыма гэта будзе тым, што спрадвеку называецца прыгожым словам “мудрасць”.

Вялікі дзякуй кожнаму, хто прыняў удзел у сёняшнім мерапрыемстве. Спадзяюся, яно было не апошнім.

***Вольга АЛІЗАР*** *22 чэрвеня 2025 года*

**На фота:** падчас літаратурнай сустрэчы ў дзіцячым лагеры “Навука”. Аграгарадок Парэчча (Гродзенскі раён).

